# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ
# 10 клас
# Варыянт 2

**Заданне 1.** Вядома, парадак павінен быць не толькі ў наваколлі, але і ў паводзінах, адносінах да жыцця. Маральным арыенцірам для людзей могуць лічыцца аўтары беларускай літаратуры, крылатыя словы якіх падказваюць нам напрамак жыцця. Прачытайце выказванні беларускіх мастакоў слова і выканайце фанетычнае заданне: пастаўце знак “+” у патрэбным слупку табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Вада – такая рэч, што не можа доўга стаяць на адным месцы: спакой – вадзе гібель.* (Якуб Колас)

| № п.п. | Пытанні | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1 | Транскрыпцыя спалучэння слоў *не можа* [н’эмо́жа] правільная? | | |
| 2 | У слове *месцы* вымаўляецца падоўжаны гук? | | |
| 3 | Словы *на адным* утвараюць адно фанетычнае слова? | | |
| 4 | У слове *стаяць* колькасць літар і гукаў супадае? | | |
| 5 | У слове *гібель* адзін гук санорны, два гукі – шумныя звонкія? | | |
| 6 | У фразе вымаўляецца 8 мяккіх гукаў? | | |

**Заданне 2.** У гарадах і вёсках існуюць аб’екты, якія забяспечваюць іх жыццядзейнасць. Гэтыя аб’екты складаюць гарадскую або вясковую ***інфраструктуру***. Пастарайцеся правільна вызначыць лексічнае значэнне кожнага з інфраструктурных найменняў і спалучыце словы з левага слупка з іх значэннямі ў правым слупку. Адказ запішыце ў наступнай форме: А1Б2В3Г4Д6Е7 (звярніце ўвагу, што адна з назваў лішняя).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | Значэнне слова |
|---|---|
| А | Саджанцы ці маладыя дрэвы, высаджаныя ў грунт для ўтварэння паласы ці ўчастка лесу |
| Б | Установа, дзе па рэцэптах урачоў робяцца і адпускаюцца лякарствы, прадаюцца санітарна-гігіенічныя, касметычныя і інш. прадметы |
| В | Сігнальнае прыстасаванне на чыгунцы, якое паведамляе, што пуць свабодны або заняты |
| Г | Спецыяльнае месца, памяшканне, будынак для захоўвання тавараў, матэрыялаў і пад. |
| Д | Градка для кветак у выглядзе якой-н. замкнутай фігуры |
| Е | Месца рознічнага гандлю спажыўнымі прадуктамі і іншымі таварамі |

| | Аб’ект інфраструктуры |
|---|---|
| 1 | аптэка |
| 2 | клумба |
| 3 | шлагбаум |
| 4 | лесапаласа |
| 5 | склад |
| 6 | рынак |
| 7 | семафор |

| А | | Б | | В | | Г | | Д | | Е | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

10 клас. Комплексная работа. Варыянт 2. Бланк для журы

**Заданне 3.** Добраўпарадкаваная мясцовасць – парк, двор ці нешта іншае – выклікае выключна прыемныя пачуцці, эмоцыі, ацэнкі. Гэта ўсё ўвасабляецца ў разнапланавых, але аднолькава пазітыўных характарыстыках, якія можна выразіць рознымі прыметнікамі. Перакладзіце іх на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| *уютный* | | *очаровательный* | |
| *удобный* | | *блестящий* | |
| *ухоженный* | | *благоуханный* | |
| *образцовый* | | *укромный* | |
| *привлекательный* | | *чудесный* | |
| *живописный* | | *шикарный* | |

**Заданне 4.** Бадай што самы прыемны вынік добраўпарадкавання тэрыторыі – яе азеляненне. Але высаджванне дрэўцаў не такая простая справа, бо для кожнага з іх, у залежнасці ад пароды, трэба падабраць найбольш спрыяльнае для росту месца. Важна таксама ўлічваць і як розныя віды дрэў могуць ужывацца адно каля другога, і эстэтыку іх агульнай кампазіцыі на адпаведнай тэрыторыі.

Ацаніце прапанаваную вам “тэрыторыю” (табліцу), улічваючы, якая граматычная форма дзеяслова прымеркавана да кожнага слупка. З улікам гэтага падбярыце шэсць патрэбных “дрэўцаў” (граматычных формаў), каб “пасадзіць” іх у пазначаных месцах.

**Узор:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| | ***еду*** | | *едзьце* |
| *рабіць* | | ***робіце*** | |

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | *адпакутуйце* |
| | *гляджу* | | |
| *мыць* | | | |
| *заняць* | | | |
| *зжаць* | | | |
| | | *спасцігнеце* | |

**Заданне 5.** Добраўпарадкаванне – гэта імкненне не толькі да парадку, але і да міру, ладу, утульнасці, да сувязі пакаленняў і пераемнасці традыцый. Прачытайце урывак з нарыса У. Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”. Запоўніце табліцу, упісаўшы ў правы слупок словы (словазлучэнне) у адпаведнай граматычнай форме згодна з пазначанымі ў левым слупку іх характарыстыкамі.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Выгляд хаты для кожнай мясцовасці быў розны. У даўніну бывалі хаты з комінам (цяпер комінам завецца пячны дымаход).*

*Найбольш тыповы выгляд хаты быў такі. Ля ўвахода, справа, быў мыцельнік – месца для мыцця посуду і кухонных рэчаў. Пасля печ. За печчу, па правай сцяне, – пол (нары). Пад полам складалі розныя рэчы. Але ўжо тады замест пола часта стаялі шырокія ложкі, адзін з завескаю, для гаспадара. Уздоўж астатніх дзвюх сцен ішлі шырокія лавы, часам з тканымі налаўнікамі. На іх маглі спаць, асабліва калі бывалі госці.*

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Назоўнік, утвораны складана-бяссуфіксным спосабам | |
| 2 | 2 вытворныя прыназоўнікі | |
| 3 | Лічэбнік, які змяняецца па родах, ліках і склонах | |
| 4 | Словазлучэнне з сувяззю “дапасаванне” з першага сказа | |
| 5 | Назоўнік, род якога не вызначаецца | |
| 6 | Азначальны займеннік | |

**Заданне 6.** Добраўпарадкаванне горада, несумненна, пачынаецца з ачышчэння. У сувязі з гэтым мы прапануем вам “ачысціць” ад памылак паведамленні, размешчаныя на рэкламных шчытах. Дапамажыце выявіць, патлумачыць і паправіць допушчаныя памылкі. Улічыце, што сярод прапанаваных могуць быць як сказы з памылкамі, так і правільныя сказы. Калі памылак няма, то напішыце “Няма памылак”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| № сказа | Сказ |
|---|---|
| **1** | Серыя магазінаў “М”: больш танней толькі ў нас, прыязджай і купляй! |
| **2** | Кожнае дзіцяці мае права на адукацыю! |
| **3** | Загарадны рэстаран X: блізка да горада, далёка ад клопату. |
| **4** | Вам прадалі не толькі дрэнны тавар, але і аказалі няякасную паслугу? Вы можаце дабіцца справядлівасці! |
| **5** | У сталовай для спартсменаў можна папрасіць гарачы кіпень. |
| **6** | На працягу першых пятнаццаці дзён дэкады надвор’е не зменіцца. |

| № сказа | Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці) | Выпраўлены варыянт сказа |
|---|---|---|
| **1** | | |
| **2** | | |
| **3** | | |
| **4** | | |
| **5** | | |
| **6** | | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Содержание территории в зимний период включает расчистку от снега и наледи проезжей части и пешеходных дорожек, вывоз снега и наледи на согласованные в установленном порядке площадки складирования снега и осуществляется в соответствии с обязательными для соблюдения требованиями технических нормативных правовых актов в части эксплуатационного состояния, допустимого по условиям обеспечения безопасности дорожного движения. *(По материалам интернет-ресурсов.)*

____________________________________________________________________

____________________________________________________________________

*Уявіце, што Вы трапілі ў Новы Горад, у якім усё так або інакш звязана з літаратурай. Пастарайцеся зразумець яго жыццё. Для гэтага спатрэбяцца веды з тэорыі, гісторыі літаратуры і ўласная творчая фантазія.*

**Заданне 8.** Гуляючы па Новым Горадзе, Вы заўважылі нешта дзіўнае: на некаторых лакацыях ёсць лішнія аб’екты. Вызначце гэтыя аб’екты і патлумачце свой выбар.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| **Гарадская лакацыя** | **Аб’екты** |
|---|---|
| алея Мастацкіх напрамкаў | скульптурныя кампазіцыі “Класіцызм”, “Сентыменталізм”, “Сярэднявечча”, “Рэалізм” |
| парк Тропаў | альтанкі метафары, параўнання, санета, эпітэта |
| сквер Эпасу | клумбы апавядання, аповесці, балады, эпапеі |
| сад “Формы вершаў” | фантаны “Актава”, “Вадэвіль”, “Рандо”, “Трыялет” |

| **Лакацыя** | **Лішні аб’ект (лішнія аб’екты)** | **Тлумачэнне выбару** |
|---|---|---|
| алея Мастацкіх напрамкаў | | |
| парк Тропаў | | |
| сквер Эпасу | | |
| сад “Формы вершаў” | | |

**Заданне 9.** Прыпынкі грамадскага транспарту ў Новым горадзе аздоблены цытатамі з твораў беларускіх пісьменнікаў. Вызначце імя пісьменніка, у гонар якога названы прыпынак, і назву твора, з якога ўзята цытата.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Прыпынак 1

На беразе Палаты, за пяць вёрст ад горада, дзе гэтая рэчка мінае бары і набліжаецца праз абшары палеткаў да Дзвіны, з’явілася тая самая Плачка. Бачылі яе на пагорку, таксама пры захадзе сонца. Яна сядала на камень, які там ляжаў у засені разложыстых бяроз. Бачылі яе сяляне, ідучы дахаты пасля дзённае працы, і падарожныя, што вярталіся з горада ўвечары.

Прыпынак 2

У галаве таўпесіліся думкі аб горадзе, таварышах, уроках, к ім падбаўлялася дзіваванне, што за зданнё ўчора было і якая чартаўня завялася ў новай хаце. На сэрцы было ўсё ж такі радасна і спакойна ад цёплае вясковае абставы.

– Ну і сібірнікі, расколы!.. На галаве пачынаюць хадзіць, – голасна і сурова загаманіў нехта на вуліцы, падышоўшы да кучы мужчын.

Архіп прыслухаўся.

| Прыпынак 3 | Прыпынак 4 |
|---|---|
| Агромны горад, цесна збіты,<br>Ўвесь блескам сонейка заліты,<br>Займаў узгоркі і нізіны;<br>Дамы стаялі, як віціны,<br>То ўдоўж, то ўпоперак радамі,<br>То закрываліся садамі<br>Або дзе ўзгоркам крутабокім;<br>А дзеваспанам адзінокім,<br>Расцерабіўшы сабе пляц,<br>Як горды пан, стаяў палац. | Нам слаўна было сядзець тут на гэтых каменнях; і мы сядзелі – сушылі на ветры спацеўшыя шыі і маўчалі. Шмат было перагаворана дарогаю – паволі прайшлі мы з ім разам трыццаць вёрст, многа я зразумеў у яго без слоў, і цяпер трэба было разысціся таксама, як выпадкова сышліся на дарозе. Было яму год дванаццаць, а я ішоў у горад, дзе ўжо жыў. Убачыў быў я яго пасярод дарогі – ён стаяў, растапырыўшы босыя ногі ў палатняных портках, і трымаў у руках шапку. |

| Нумар прыпынку | Імем якога пісьменніка названы прыпынак | З якога твора цытата |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |
| 4 | | |

**Заданне 10.** Летам 2027 года ўвесь Новы Горад збіраецца святкаваць 145-годдзе з дня нараджэння аднаго з самых вядомых беларускіх пісьменнікаў. Ён больш вядомы як паэт і драматург. Спектакль па адной з яго п’ес з’яўляецца візітнай карткай самага вядомага беларускага драматычнага тэатра. Першы зборнік вершаў “Жалейка” стаў цэлай з’явай у новай беларускай літаратуры.

Вы як адзін з найлепшых знаўцаў беларускай літаратуры былі запрошаны ў каманду, што распрацоўвае канцэпцыю літаратурнага афармлення гарадской прасторы (графіці, муралы, светлавыя інсталяцыі, іншае), заснаваную на **адным** літаратурным творы пісьменніка, юбілейную дату якога збіраюцца святкаваць жыхары Новага Горада. Вам неабходна выканаць некалькі заданняў.

1. Запішыце імя пісьменніка, юбілейную дату якога рыхтуюцца святкаваць жыхары Новага Горада, і назву твора, на аснове якога Вы маеце намер афармляць гарадскую прастору.
2. Коратка апішыце 2 аб’екты афармлення. Патлумачце, як Ваша ідэя афармлення звязана з ідэяй выбранага Вамі твора. Для афармлення выбірайце прынцыпова розныя аб’екты і аформіце іх па-рознаму.
3. Апішыце (да 100 слоў), як ідэя афармлення гарадской прасторы ў сувязі з выбраным Вамі творам паўплывае на ўспрыманне горада жыхарамі і гасцямі.
4. Прывядзіце 2 цытаты з **гэтага** твора, што будуць высечаны на помніку пісьменніку, адкрыццё якога запланавана ў дзень святкавання 145-годдзя. Патлумачце адным-двума сказамі, чаму Вы выбралі менавіта гэтыя цытаты (тлумачэнне павінна быць на кожную цытату асобна).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | |
|---|---|
| **Імя пісьменніка** | |
| **Назва твора** | |

## Аб’екты афармлення

| **Аб’екты афармлення, як яны будуць аформлены** | **Як ідэя афармлення звязана з ідэяй выбранага твора** |
|---|---|
| | |
| | |

***Ідэя афармлення гарадской прасторы***

________________________________________________________________

________________________________________________________________

## Цытаты на помнік

| **Цытата** | **Тлумачэнне, чаму менавіта гэтыя радкі трэба змясціць на помніку** |
|---|---|
| | |
| | |